# Прамова дэпутата ПРЫТЫЦКАГА С. О.

Таварышы дэпутаты! З пачуццём вялікай радасці, велізарнага задаволення праслухалі мы, дэпутаты вызваленага народа, даклад Вячаслава Міхайлавіча Молатава. Гэта-ж яшчэ зусім нядаўна, якіх-небудзь шэсць месяцаў назад, жылі мы ў польскай дзяржаве, якая трымалася на шыбеніцах, турмах, расстрэлах, бяспрыкладным нацыянальным прыгнечанні беларусаў, украінцаў і яўрэяў, на бесчалавечнай эксплаатацыі рабочых і сялян. І вось мы, пасланцы свайго народа, поўнапраўныя грамадзяне краіны сацыялізма, слухалі даклад главы ўрада буйнейшай у свеце дзяржавы—дзяржавы рабочых і сялян.

Даклад таварыша Молатава, кожнае яго слова сведчылі аб сіле, непахіснай мужнасці, маральнай перавазе магутнага савецкага народа, які няўхільна стаіць на варце міру, дае бязлітасны адпор падпальшчыкам вайны, выкрывае іх крывавыя замыслы і штодзённа паказвае прыклад сапраўднай павагі незалежнасці малых народаў. Такі народ непераможны. Такі ўрад па-сапраўднаму прадстаўляе народныя інтарэсы. Яго знешняя палітыка — увасабленне сталінскага розуму, дастоінства і справядлівасці.

Мне тут, таварышы, успомнілася нядаўна прачытаная газетная заметка. Яна паведамляла аб дзейнасці так званага польскага ўрада ва Францыі. Генералы сікорскія, рыдз-сміглы і іншыя, якія тэрытарыяльна абасноваліся ў адной з французскіх гасцініц, аб'явілі «ўсім, усім, усім», аб стварэнні «польскага ўрада». У патрапаных і абвятшаўшых генеральскіх штанах, гэтыя з дазволу сказаць дзяржаўныя мужы, гэтыя вялікапольскія мальбрукі ашчаслівілі свет паведамленнем, што ўноў з'яўлены ўрад функцыянірує і што яны бяруць на сябе місію прадстаўляць інтарэсы народаў польскай дзяржавы.

Як відаць, пачуццё смешнага назаўсёды пакінула польскіх дзяржаўных мужоў, разгубіўшых пры фарсіраваным бегстве з Рэчы Паспалітай астаткі розуму, калі толькі ён наогул у іх быў. Каму патрэбны гэтыя не толькі абанкрутаваўшыяся, праідгаўшыяся, але і звяр'яцеўшыя пігмеі? Якія адносіны яны маюць да інтарэсаў заходніх беларусаў і украінцаў?

Нашы народы недвусэнсоўна выказалі свае інтарэсы, сваю волю. Праз Народнае Сабранне яны ва ўвесь голас заявілі аб стварэнні савецкай улады. Нас, сваіх дэпутатаў, яны аднадушна паслалі ў Вярхоўны Совет Саюза ССР прадстаўляць іх інтарэсы, нам яны аддалі галасы, праявіўшы ў часе выбараў выключную актыўнасць, высокую палітычную свядомасць, бязмежную любоў да слаўнай комуністычнай партыі. Выбары ў Вярхоўны Совет з'явіліся вялікім усенародным святам, паказаўшым усяму свету магутнасць савецкай дзяржавы, несакрушымае адзінства народа вакол яго роднага ўрада і комуністычнай партыі.

Усім-жа панам генералам з так званага «польскага ўрада» мне хацелася-б напомніць аб адной крылоўскай лягушцы, якая пыжылася-пыжылася ў прыпадку маніі веліччы і ў выніку, калі мякка выразіцца, некалькі пашкодзіла свайму здароўю. А вам-жа, паны генералы, прадстаіць немалая работа — штодзень і штоноч дагаджаць гасцінным гаспадарам, выконваць іх гаспадарчую волю. Так што і з вамі, паны генералы, можа здарыцца нешта падобнае.

Успамінаючы тут, таварышы дэпутаты, на гэтай высокай трыбуне, аб нікчэмнай, абанкрутаваўшайся, бяздарнай і тупаумнай польскай кліке, так многа шкодзіўшай маёму народу, мне хочацца яшчэ раз выказаць сваю бясконцую радасць чалавека, пзбыўшага цяпер сапраўдную радзіму, сапраўднае шчасце, сапраўднае чалавечае жыццё, жыццё яркае, творчае, поўнакроўнае. І пачуцці маі — гэта пачуцці 5 мільёнаў беларускіх працоўных, вызва-



леных доблеснай Чырвонай Арміяй ад ненавіснага іга польскіх капіталістаў і памешчыкаў.

Таварышы! Калі даклад Вячаслава Міхайлавіча Молатава з'яўляўся ўвасабленнем магутнасці, дастоінства і розуму нашай краіны, то даклад таварыша Зверэва аб бюджэце Совецкага Саюза на 1940 год — яркае сведчанне няўхільнага гаспадарчага ўздыму социялістычнай дзяржавы, росту яе прамысловасці, сельскай гаспадаркі, матэрыяльнага і культурнага дабрабыту працоўных, росту яе абароннай магутнасці.

Асігнаванні, прадугледжаныя на абаронныя мэты, падтрымае ўвесь 183-мільённы совецкі народ, бо яны адпавядаюць задачам, пастаўленым у дакладзе таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП(б) і ў дакладзе таварыша Молатава аб знешняй палітыцы ўрада на нашай Сесіі.

Я думаю, што выкажу думку ўсіх дэпутатаў, калі скажу, што Сесія цалкам і поўнасцю зацвердзіць прадстаўлены Советам Народных Камісараў СССР бюджэт як у яго даходнай, так і ў расходнай частцы, і асабліва асігнаванні на ўмацаванне абароннай магутнасці нашай радзімы.

Прадстаўлены бюджэт, як у люстры, адбівае інтарэсы эканамічнага і культурнага росту саюзных рэспублік. У параўнанні з 1939 годам бюджэт БССР павялічыўся на 815 млн. руб.

Мне асабліва радасна чуць, што бюджэтам прадугледжаны велізарныя капіталаўкладанні ў народную гаспадарку заходніх абласцей БССР. Ужо ў 1940 годзе гэтыя капіталаўкладанні складуць 98.200 тыс. руб. Вялікая частка гэтай сумы прадназначаецца на социяльна-культурныя мерапрыемствы, на народную асвету, ахову здароўя і комунальнае будаўніцтва. Толькі па адной Беластоцкай вобласці асігнаванні на народную асвету складуць 2.500 тыс. руб., на ахову здароўя — 1.630 тыс. руб. К слову сказаць, былы польскі ўрад за дваццаць год не выдаткаваў столькі сродкаў на неадкладныя патрэбы народа, колькі расходуецца совецкім урадам за адзін год.

За некалькі месяцаў існавання совецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі праароблена велізарная творчая работа. У Беластоцкай вобласці поўнасцю пушчаны ў ход усе буйныя фабрыкі і заводы, а некаторыя з іх занава рэканструіраваны. Беластоцкія ткачы прасілі нас, дэпутатаў, перадаць Вярхоўнаму Совету,

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы